# МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦТВАЎ «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ». ПРАЕКТ «ТЭАТРАЛЬНЫЯ СУСТРЭЧЫ» 2017 г.

***А. Д. Вавілаў,***
*загадчык кафедры рэжысуры эстрады*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сваю гісторыю вядзе з 1992 г. Ініцыятарамі яго правядзення выступілі некамерцыйныя арганізацыі Беларусі, Украіны і Расіі. За гады існавання фестываль мастацтваў стаў своеасаблівай візітнай карткай Рэспублікі Беларусь [1].

Першапачаткова мэтай арганізатараў было пазнаёміць жыхароў і гасцей горада з музычнай культурай і творчасцю славянскіх народаў. Гэту місію фестываль выконваў заўсёды, а ў 2000 г. тут сустрэліся прадстаўнікі ўсіх славянскіх краін.

За гады існавання рамкі свята мастацтваў істотна пашырыліся і ён стаў пляцоўкай для дыялогу не толькі славянскіх культур. Пра спецыяльную місію форума сведчыць яго дэвіз: «Праз мастацтва – да міру і ўзаемаразумення». Удзельнікамі фестывалю за час яго існавання станавіліся госці і артысты амаль з 70 краін свету, якія прадстаўлялі ўсе кантыненты планеты.

Праграма Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўвесь час мяняецца, пастаянны творчы эксперымент дазваляе замацаваць і паўтараць з года ў год запатрабаваныя і паспяховыя праекты, якія з цягам часу становяцца традыцыйнымі. Так, у рамках фестывалю мастацтваў ужо другі дзясятак гадоў праводзяцца «Тэатральныя сустрэчы», увесь час пашыраецца «Дзень моладзі на Славянскім базары», не губляюць папулярнасці прэс-канферэнцыі зорак тэатра і эстрады «Зорная гадзіна», знайшоў свайго гледача праект тэатра лялек «Лялечны квартал», які стартаваў у 2014 г.

Адметнай асаблівасцю фестывалю з’яўляецца тое, што ў дні яго правядзення задзейнічаны практычна ўсе канцэртныя пляцоўкі і залы горада. Канцэрты праходзяць пад адкрытым небам, увесь час расце «Горад майстроў» – кірмаш традыцыйных народных рамёстваў, у якім бяруць удзел народныя майстры і творчыя калектывы з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, Украіны, Польшчы і іншых краін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнародная федэрацыя арганізатараў фестываляў (FIDOF) прыняла ў свае рады фестываль «Славянскі базар у Віцебску» у 1993 г. І двойчы (у 2000 і 2004 гг.) ён быў адзначаны як «Лепшы фестываль года».

Тэатральная праграма ў рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» з'яўляецца адной з асноватворных. Запрашэнне папулярных акцёраў і знакамітых калектываў стала адной з лепшых фестывальных традыцый, якая мае дваццацігадовую гісторыю.

Тэмперамент, прырода акцёрскай душы і хвалі пераўтварэння, фантазіі адчайных рэжысёраў-летуценнікаў, спецэфекты і новыя трактоўкі сістэмы К. С. Станіслаўскага – вось тое поле, на якім расце творчы праект «Тэатральныя сустрэчы».

Тэатр – гэта парыў, вечны пошук новага светапогляду. Тэатр – пастаянны момант нараджэння новай энергіі. Магчыма, менавіта на тэатральнай сцэне нараджаецца новы від энергіі, якую не знойдзеш у падручніках па фізіцы і аб якой трызняць лагічныя і не веруючыя ў казкі вучоныя.

«Лялечны квартал» – новы праект Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар ў Віцебску», ён існуе з 2014 г. У рамках праекта ў дні фестывалю праходзяць паказы лепшых лялечных спектакляў беларускіх і расійскіх тэатраў. Арганізатары праекта запрашаюць у фестывальны «Лялечны квартал» лепшыя лялечныя трупы – тэатры з Санкт-Пецярбурга, Яраслаўля, Масквы, Гродна, Мінска, якія прывозяць у Віцебск самыя паспяховыя спектаклі апошніх гадоў для дарослай аўдыторыі. Як адзначае куратар «Лялечнага квартала» У. Цвікі, у гэтага незвычайнага для фестывалю праекта для дарослых заўсёды будзе свой глядач.

Спектаклі маскоўскага Тэатра на Паўднёвым Захадзе заўсёды ўражваюць прафесіяналізмам і асаблівай, уласцівай толькі гэтаму калектыву стылістыкай. Напрыклад, сёлета п'еса С. Брулота «Гульня ў Напалеона» і трагедыя У. Шэкспіра «Макбет» – даніна сакраментальнай і непагаснай цікавасці да асоб, якія мянялі гісторыю, да геніяльных дыктатараў, якія куплялі захапленне і глыбокую пашану здрадай і крывёю. Абедзве пастаноўкі выклікалі шквал эмоцый і авацый.

Стваральнік і кіраўнік Тэатра на Паўднёвым Захадзе – беларус В. Беляковіч, ён прыязджаў у Віцебск на працягу без малога



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзесяць гадоў. Цяпер пра гэтага феерычнага на выдумку рэжысёра кажуць яго работы. Да 40-годдзя знакамітага калектыву ў фае Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа была наладжана ўнікальная выстаўка. У экспазіцыі прасочвалася ўся гісторыя Тэатра на Паўднёвым Захадзе, які распачаў шлях да вяршынь у будынку раённай бібліятэкі ў Вастракове, якой на пачатку свайго творчага шляху загадваў В. Беляковіч. Першыя афішы былі рукапісныя, пазнейшыя выкананы ў шматкаляровым друку. Шматлікія з іх распавядаюць пра тыя спектаклі, якія публіка бачыла падчас фестывалю. З 2009 г. Віцебск апладзіраваў такім рэжысёрскім пастаноўкам В. Беляковіча, як «Лялькі», «Майстар і Маргарыта», «Сон у летнюю ноч», «Рэвізор», «Баба Шанэль», «Мальер», «Утаймаванне свавольніцы», «Фотаапараты» [2]. Наведвальнікі са слязамі на вачах разглядалі фатаграфіі, якія захавалі Валерыя Беляковіча ў шматлікіх вобразах, адыграных ім на сцэне любімага тэатра, у якім і цяпер не спыняецца пошук новай светапогляду.

Завяршаў праграму «Тэатральных сустрэч» 2017 г. мюзіклкомікс «Казанова», які пастаўлены ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Спектакль заслужана атрымаў высокую адзнаку гледачоў і крытыкі.

Сапраўднае і будучае беларускага тэатральнага мастацтва шмат у чым залежыць ад маладых, таленавітых, мэтанакіраваных. Воля і жаданне здзіўляць – тое, чым жыве сёння тэатральны праект Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

У сваім выступленні на расійска-беларускім тэатральным семінары ў Маскве генеральны дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» А. П. Сідарэнка згадаў пра стварэнне новых тэатральных пляцовак у плыні сучаснага фестывалю, што сёлета «будзе паказана восем спектакляў. Трэці год запар паспяхова развіваецца міжнародная лялечная праграма, фэсты вулічнага тэатра... Напрыклад, вельмі цёпла ўспрыняты публікай фэст "На сямі вятрах", ён заўжды поўны новых ідэй. На пяць дзён цэнтр Віцебску пераўтворыцца ў імправізаваныя сцэны. Артысты з розных куткоў свету прадставяць розныя накірункі вулічнага мастацтва: тэатральныя пастаноўкі, "жывыя" статуі, рок-музыку, файер-шоў, танцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступленні паэтаў і мастакоў». Ён адзначыў, што «неабходна больш планамерная падтрымка» ўсіх праектаў тэатральнага напрамку. «У Віцебск з года ў год прыязджаюць вядучыя тэатры нашых краін, аднак у апошні час мы сышлі ў бок антрэпрызных спектакляў, так танней. Пры наяўнасці пэўнай падтрымкі Міністэрства культуры гэты праект можна развіваць» [3].

Праграма Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пацвярджае простую і вечную праўду: тэатр – бясконцы.


*1.* Аб Міжнародным фестывалі мастацтваў Славянскі базар у Віцебску : пастанова Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь, 25 сак. 2009 г., № 6 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2009.

*2. Гринь, Е. И.* Театр нашего времени [Электронный ресурс] / Е. И. Гринь // Славянский базар в Витебске. – Режим доступа : http://fest-sbv.by/news/1726-teatr-nashego-vremeni.html.

*3. Хорошилова, Т. И.* К нам летит сам Иглесиас [Электронный ресурс] / Т. И. Хорошилова // СБ Беларусь сегодня. – 2017. – 23 марта. – Режим доступа : https://www.sb.by/articles/k-nam-letit-sam-iglesias.html


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КУЛЬТУРОТВОРЧЕСКИЙ ПОТЕНЦИАЛ СМИ: ФАКТОРЫ ИНТЕГРАЦИИ И ПРОТЕКЦИИ


***В. А. Волков,***

*магистр культурологии, аспирант, преподаватель кафедры межкультурных коммуникаций Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Интеграция национального медиапространства и, как следствие, представленность белорусской культуры зависит не только от технологической готовности общества, но и от многообразия новых форм трансляции культуры. Поэтому анализ преимуществ и недостатков новых культуротворческих форм СМИ (интернет-вещания, блогов) как инструмента культурных коммуникаций позволяет обосновать их потенциал как механизм интеграции белорусских СМИ в глобальное медиапространство.

Интернет-телевидение – это новый вид трансляции аудиовизуальной информации. Его перспектива обусловлена следующими позициями: новаторством, удобством использова-